ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

ДЗЕДЗІЧ

Зберагчы і памножыць

# ДЗЕДЗІЧ

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 6 (25)

СНЕЖАНЬ 2003

2 БНФ ІМКНЕЦЦА ДА РАЗВІЦЦЯ

4 АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ Ў БрДУ

6 АД МАЛОГА ДА ВЯЛІКАГА – «СТАНАЎЛЕННЕ»

8 АБАВЯЗАК КОЖНАГА – БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМ

# "У ЦІШЫ НАРАДЖАЕЦЦА СЛОВА..."

***"Увесь час мы нечага дабіваемся, за нешта змагаемся. Так і жыццё прайшло ў змаганні. Спадзяюся, што нашыя наступныя пакаленні будуць проста жыць..."***
***В. Іпатава***



2 СНЕЖНЯ Ў БЕРАСЦЕ ПА ЗАПРАШЭННІ БАМГА "СУЗОР'Е" ЗАВІТАЛА ЗНАНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПІСЬМЕННІЦА, ЦІКАВЫ І ШМАТГРАННЫ ЧАЛАВЕК, – ВОЛЬГА ІПАТАВА. ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА З ЁЙ АДБЫЛАСЯ Ў АКТАВАЙ ЗАЛІ СТАРОГА КОРПУСА УНІВЕРСІТЭТА – А МЕСЦА ЎСІМ ЖАДАЮЧЫМ ПРЫСУТНІЧАЦЬ УСЁ-РОЎНА НЕ ХАПІЛА.

У Берасце спадарыня Вольга прыехала з прэзентацыяй сваёй новай кнігі "Альгердава дзіда", куды ўвайшлі тры гістарычныя раманы, прысвечаныя часам станаўлення Вялікага княства Літоўскага і асобам, якія аказалі значны ўплыў на фармаванне беларускай дзяржавы.

У кнізе Вольга Іпатава па-новаму адкрывае беларускую гісторыю, паказвае гістарычную праўду, што, як вядома, не вельмі лёгка ў цяперашняй сітуацыі, не лёгка было і раней. За аповесць "Прадыслава", да прыкладу, аўтарку не друкавалі два гады. "Але, – падзялілася з намі пісьменніца, – праўда ўсё роўна зойме сваё месца. Я проста паказваю, што гэта наша беларуская спадчына, не канфліктуючы з гісторыяй іншых народаў. Я проста кажу, што гэта наша".

На сустрэчу з Вольгай Іпатавай завіталі берасцейскія аўтары Зінаіда Дудзюк ды Іван Мельнічук. Спадарыня Зінаіда расказала пра свае сустрэчы з Вольгай Іпатавай, падзялілася ўражаннямі ад яе творчасці. Свае апошнія вершы прэзентаваў аўдыторыі Іван Мельнічук.

Падчас сустрэчы спадарыня Вольга прачытала шэраг сваіх вершаў, адказала на пытанні аўдыторыі. Цікавым нам падаўся адказ на пытанне пра адносіны пісьменніцы да гучнай апошнім часам стужкі "Анастасія Слуцкая". "Да фільма я адношуся станоўча. – адзначыла Вольга Іпатава. – Няхай лепш будзе "Анастасія Слуцкая", чым "Любить по-русски" на беларускія грошы. Хай будзе болей "Анастасій Слуцкіх", тады, можа, пачнуць з'яўляцца і высокамастацкія беларускія творы". Пыталіся ў пісьменніцы, ці адчувае яна ціск з боку каго- ці чаго-небудзь: "Канешне, адчуваю, калі рэцэнзію Уладзіміра Конана на маю кнігу чатыры месяцы трымае "ЛіМ". Але я аптыміст і спакойна гляджу на гэта. Прывыкла. Усё роўна рэцэнзіі з'яўляюцца, кнігі даходзяць да чытача. Галоўнае, каб чыталі. Калі цябе не чытаюць – ад гэтага варта плакаць".

Упэўнена, што ўсе прысутныя адзначылі выключную ролю Вольгі Іпатавай як пісьменніцы для беларускай літаратуры і як чалавека – для станаўлення беларускага грамадства. У часе відавочнага крызісу, які сёння перажывае беларуская інтэлігенцыя, В. Іпатава застаецца прыкладам непахіснасці і прынцыповасці ва ўсіх пытаннях, што тычацца беларускасці.

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**



**На сустрэчы з пісьменніцай. 2 снежня 2003г.**

## ДАВЕДКА «ДЗЕДЗІЧА»

**Вольга Іпатава** нарадзілася 1 студзеня 1945г. у мястэчку Мір, што на Гарадзеншчыне. Скончыла БДУ (1967г.), аспірантуру Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве (1978г.). Настаўнічала, працавала на тэлебачанні.

У розны час працавала ў рэспубліканскіх выданнях "Літаратура і мастацтва", "Чырвоная змена". Была намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Спадчына" (1989-1991гг.), рэдагавала штодзённік "Культура" (1991-1995гг.). З 1998 па 2001гг. з'яўлялася першым намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, а з 29 траўня 2001г. па 24 верасня 2002г. узначальвала Саюз.

Друкуецца з 1956г. Выйшлі зборнікі паэзіі "Раніца" (1969г.), "Ліпеньскія навальніцы" (1973г.), "Парасткі" (1976г.); кнігі прозы "Вецер над стромай" (1977г.), "Дваццаць хвілін з Немезідай" (1981г.), "Перакат" (1984г.), "За морам Хвалынскім" (1989г.).

Для беларускага масавага чытача В. Іпатава найбольш вядомая як аўтар гістарычнай прозы. Так аповесць "Прадыслава" (1977г.) прысвечана Ефрасінні Полацкай, аповесць "Чорная княгіня" (1989г.) – пра трагедыю княгіні Елізаветы Астрожскай. Гістарычныя персоны XI – XIX стст. увасобіліся ў аповесцях "Святаслава" (1984г.), "Агонь у жылах крэменю" (1987г.), рамане "Залатая жрыца Ашвінаў" (1997г.). В. Іпатава з'яўляецца аўтарам балад, нарысаў, п'ес, паэм, кніг для дзяцей. Выступае як крытык, публіцыст, перакладчык.

З 1970г. з'яўляецца членам СП Беларусі, з 1995г. – ганаровым акадэмікам Міжнароднай акадэміі Еўразіі. Мае ўзнагароды: ордэн "Знак Пашаны", медаль Францыска Скарыны, граматы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Кіргізіі.

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Фонд "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Калі вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### У «МАТРЫЦЫ» ЗМАГАЛІСЯ СА СНІДАМ

Дзень барацьбы са СНІДам адзначыла 29 лістапада ў клубе "Матрыца" берасцейская студэнцкая моладзь.

Тэматычная вечарына "Усё ў тваіх руках", якая праходзіла ў форме ток-шоў, была арганізавана Гарадскім аддзелам адукацыі пры падтрымцы Абласнога Цэнтра прафілактыкі СНІД, адміністрацыі Парка культуры і адпачынку, БАМГА "Сузор'е".



Удзельнікі вечарыны, студэнты ўсіх ВНУ і ПТВ, 2-х тэхнікумаў, мелі магчымасць задаць пытанні спецыялістам, якія вядуць барацьбу з распаўсюджваннем ВІЧ-інфекцыі. Вядучы Віктар Сакалоў віртуозна кіраваў выступоўцамі, адкрываючы перад слухачамі ўсё новыя грані вострай праблемы цывілізацыі. І па цішыні ў залі падчас выступаў, па актыўным удзеле ў дыскусіі было бачна, як расце ў вачах аудыторыі цікавасць да праблемы пашырэння ВІЧ у свеце і на Беларусі.

Пасля віктарыны, прызы да якой былі прэзентаваныя кіраўніцтвам клуба "Матрыца", моладзі далі магчымасць патанчыць. Па словах удзельнікаў, імпрэза ў «Матрыцы» прынесла значна больш карысці, чым добры дзясятак сумных і нікому не цікавых лекцый.

Цікава, што на час вечарыны кіраўніцтва клуба зняло з продажу спіртовыя напоі, а ўвесь іншы асартымент прадавала па коштах, значна ніжэйшых за звычайныя.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**
**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА"**
**з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, якія пабачыць свет у сярэдзіне студзеня 2004 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 20-57-41 да 08.01.04.**

# ІМКНЕННЕ ДА РАЗВІЦЦЯ

НОВАЕ КІРАЎНІЦТВА БЕРАСЦЕЙСКАЙ ГАРАДСКОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫІ БНФ ПРЫНЯЛО ПРАГРАМУ РАЗВІЦЦЯ НА 2003-2004гг. ПРАГРАМА ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ЗНАЧНУЮ АКТЫВІЗАЦЫЮ ДЗЕЙНАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ, ПАВЕЛІЧЭННЕ ПАРТЫЙНЫХ ШЭРАГАЎ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ ІДЭАЛОГІІ ПАРТЫІ БНФ. ЯКІЯ ПРАЦЭСЫ ПАСПРЫЯЛІ З'ЯЎЛЕННЮ ГЭТАЙ ПРАГРАМЫ, МЫ ПАСПРАБАВАЛІ ВЫСВЕТЛІЦЬ У АДНАГО З ЯЕ АЎТАРАЎ, СТАРШЫНІ ГАРАДСКОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫІ БНФ НІНЫ ДАВЫДОЎСКАЙ.



Н. Давыдоўская з пляменніцай

**– Наколькі я ведаю, у канцы лістапада 2003г. у берасцейскай арганізацыі Партыі БНФ змянілася кіраўніцтва. Праграма была прапанаваная новым кіраўніцтвам?**

– Натуральна. Людзі, якія становяцца на чале арганізацыі, мусяць мець дакладнае ўяўленне аб тым, што яны збіраюцца рабіць. І мы павінны былі прэзентаваць якасныя і колькасныя крытэры эфектыўнасці нашай працы на кіраўнічых пасадах. Таму 28 лістапада, на першым пасяджэнні гарадской Рады і была прынята гэтая Праграма.

**– Ці не маглі б Вы больш падрабязна распавесці пра тыя паказчыкі, па якіх будзе ацэньвацца праца кіраўніцтва?**

– У першую чаргу, мы плануем праводзіць штомесяц (як мінімум) акцыі, скіраваныя на папулярызацыю Партыі БНФ, руху "БНФ-Адраджэньне" у грамадстве. Гэта могуць быць раздачы і распаўсюд улётак, мітынгі, пікеты, сходы, сустрэчы з выбаршчыкамі, публікацыі ў СМІ.

Па-другое, для стварэння сярод сябраў Партыі БНФ каманднага духу, атмасферы даверу і ўзаемапавагі мы будзем ладзіць унутраныя нефармальныя мерапрыемствы: вечарыны, летнікі, пікнікі, вандроўкі. Адной з праблем, якія непакояць сябраў арганізацыі, ёсць недахоп міжасабовых стасункаў паміж суполкамі. Некаторыя, асабліва тыя, хто не так даўно прыйшоў да нас, нават не знаёмыя адзін з адным. І гэтую праблему мы паспрабуем вырашыць.

І, у рэшце, мы плануем праз актывізацыю нашай дзейнасці прыцягнуць да сябе новых людзей, якія неабыякава ставяцца да будучыні незалежнай і дэмакратычнай Беларусі. Мы ставім на мэце ўдвая павялічыць за 2004г. колькасць сябраў Партыі БНФ у горадзе.

Сярод іншых задач, якія нам давядзецца вырашаць, я бы выдзеліла адкрыццё і наладжванне працы сядзібы гарадской арганізацыі Партыі БНФ, удзел у адзначэнні традыцыйных, прысвечаных значным падзеям беларускай гісторы акцыях 25 сакавіка і 26 красавіка 2004г., развіццё традыцыяў супрацоўніцтва з дзяржаўнымі, камерцыйнымі і няўрадавымі арганізацыямі Берасця, умацаванне матэрыяльнай базы Берасцейскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ.

**– За той час, які мінуў з моманту прыняцця Праграмы, што ўжо зроблена?**

– Першай акцыяй, скіраванай на папулярызацыю партыі ў грамадстве, стала раздача ўлётак, прысвечаных Міжнароднаму дню правоў чалавека 10 снежня. Мы раздавалі ўлёткі-віншаванні каля завода "Цветатрон" – заклікалі людзей адстойваць свае права на годны ўзровень аплаты працы, які дазваляе нармальна жыць і ўтрымліваць сям'ю – права, зафіксаванае ў Канстытуцыі РБ.

Галоўным вынікам гэтай акцыі я б назвала адчуванне моцнай падтрымкі нашай дзейнасці з боку працоўных. Няхай не кожны з іх сёння знойдзе смеласць адкрыта падтрымаць нас ці стаць сябрам дэмакратычнай партыі, але мы выразна адчулі, што пераважная большасць тых, да каго мы звярталіся, спачувае нам і прыхільна ставіцца да нашай дзейнасці. І гэтае адчуванне безумоўна натхняе нас на навязванне актыўных стасункаў з як мага шырэйшымі коламі грамадства.

**– А як кіраўніцтва завода паставілася да вашай акцыі?**

– Без непрыемнасцяў, нажаль, не абышлося. Праз 20 хвілін пасля пачатку акцыі да прахадной пад'ехаў нарад міліцыі, выкліканы адміністрацыяй, і мяне запрасілі на тлумачальную размову ў Маскоўскі РАУС. Хаця, трэба адзначыць, што і там стаўленне да мяне, як сябра Партыі БНФ было вельмі паважлівае. Міліцыянты доўга апраўдваліся, што, маўляў, такая ў іх праца. Ну а я са свайго боку нагадала ім, што падчас нядаўніх падзеяў у Грузіі ў міліцыі хапіла розуму не ўвязвацца ў палітычнае супрацьстаянне, і гэта павінна стаць добрым прыкладам для беларускіх міліцыянтаў.

А наперадзе ў нас яшчэ шмат акцый, скіраваных на павышэнне іміджу нашай партыі сярод працоўных, студэнтаў, інтэлігенцыі, прадпрымальнікаў.

**– Вялікі дзякуй за змястоўныя адказы.**



**Раздача ўлётак-віншаванняў ля «Цветатрона» скончылася затрыманнем кіраўніка Берасцейскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ.**

**Гутарыў**
**Уладзімір ТАРНОЎСКІ**

# ЧАМУ ДЗЕЦІ ЗАБЫВАЮЦЬ БАЦЬКОЎ,

## АБО У ЧЫМ СЭНС ЖЫЦЦЯ

ТОЕ, ШТО ГРОШЫ КАМЕНЬ ДЗЯЎБУЦЬ, – ГЭТА ДАЎНО ВЯДОМА, АЛЕ, КАЛІ ПРЫ ГЭТЫМ ЯНЫ ДАМІНУЮЦЬ ВА ЎСІМ АСТАТНІМ, ТО ГЭТА ВЫКЛІКАЕ АБУРЭННЕ І ХВАЛЯВАННЕ ЗА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ.

На жаль, зараз настаў такі час, што даводзіцца жыць толькі з адною думкаю: "Дзе ўзяць грошы?" А калі ты не думаеш пра гэта, то "гэта" само прымусіць цябе думаць.

Напэўна, нехта здагадаўся, да чаго я схіляю? Але не хвалюйцеся! Усё вельмі проста, і я паспрабую зрабіць так, каб ніхто не пакрыўдзіўся.

Тое, што грошы камень дзяўбуць, даўно вядома, але знаёмая рэч і такая, што грошы псуюць чалавека. Асабіліва гэта вядома тым, хто мае сапраўднае чалавечае сумленне і жыве па сваіх уласных законах, а не па "законах грошай". Ну, а больш "грашавітыя" дзядзенькі і цёценькі хоць і ведаюць гэта, ды робяць выгляд, быццам усё так і павінна быць. Але гэтага не варта рабіць.

Вось уявіце сабе, калі ласка, карціну: малады хлопец пачынае сваю "справу" з "нуля", і атрымліваецца так, што вельмі хутка ён робіцца багатым. А зрабіўшыся багатым, ён пачынае траціць свае грошы налева і направа, на тое, што трэба і не: купляе дарагую машыну за "кускоў" дваццаць, хоць тут не бачна ніякай альтэрнатывы, бо заўтра гэтую машыну будзе шукаць уся міліцыя, а абвесткі на слупах: "Вярніце, калі ласка, за ўзнагароду!", – будуць выклікаць толькі ўсмешкі на тварах; ці тую ж машыну знойдуць з п'яным спадаром у тым жа слупе з абвесткамі, ці падараваць свой супернаварочаны мабільны тэлефон якой-небудзь доўганогай бландзінцы за яе нумар тэлефона. Напэўна, у гэтым і ёсць сэнс жыцця.

У лепшым выпадку, той жа малады хлопец можа адчуць асалоду ад жыцця, прачнуўшыся ранкам у місе з чорнай ікрой ці ў абдымках той жа белакурай феі дзе-небудзь на Кіпры.

Але ніхто ў гэтую гадзіну не задумаўся пра тое, што дома ў яго бацькі, як яны там! І тут не павінна быць галоўным, багатыя яны, ці не, а ўсяму патрэбна даць адказ: "Яны мае бацькі".

І не трэба дзівіцца на іхні ўзрост і заробак, а патрэбна проста заставацца добрасумленным чалавекам і памятаць, што ты некалі таксама будзеш бацькам, а грошы – справа нажыўная, і не трэба думаць, што ў грошах ёсць сэнс жыцця.

**Мікола СІМАНОВІЧ**

# В БЕЛАРУСИ ВОЗРОДИЛИ ЗАМПОЛИТОВ, А КОМСОМОЛЬЦАМ ДАЛИ ЛЬГОТЫ

«Надо агитировать, чтобы «отморозки» к власти не пришли», – заявил Александр Лукашенко на обсуждении проекта идеологического указа.

И вот уже полгода белорусы активно создают свою идеологию. Ради великого дела выделены большие деньги – Академии наук Республики Беларусь дали более $2 млн. на разработку идеологической программы страны, пишет «Комсомольская правда».

А пока она создается стихийно. На предприятиях, например, уже есть должности заместителя руководителя по идеологии. В обязанности «замполиту» вменяется: «разъяснять внутреннюю и внешнюю политику государства, обеспечивать своевременное реагирование на критические выступления в прессе в адрес организации, сотрудничать с правоохранительными органами».

Еще дальше в создании идеологии продвинулись белорусские комсомольцы-БРСМ-овцы. Каждому новобранцу они выдают брошюру с перечнем скидок, на которые тот теперь имеет право. Льготы от двух до ста процентов буквально на все: на покупку сотового телефона, косметику, одежду, обувь. И даже – прости, Господи, – на ритуальные услуги.

Неудивительно, что в комсомольские ряды в последнее время стали записываться даже те, кто не проходит по возрасту: и учителя, и завучи, и продавцы предпенсионного возраста.

**www.charter97.org**

# У БЕЛАРУСКІХ ШКОЛАХ ЗАБАРАНЯЮЦЬ РАСПАЎСЮД НЕЗАЛЕЖНЫХ ВЫДАННЯЎ

Адміністрацыя Крычаўскага ліцэя пад пагрозай адлічэння з навучальнай установы забараніла сваім выхаванцам распаўсюджваць мясцовыя недзяржаўныя маланакладныя газеты, што выдаюцца Крычаўскім грамадскім інфармацыйным цэнтрам "Кантакт".

Папераджальную размову з навучэнцамі, якія былі заўважаныя за гэтым заняткам, правёў асабіста дырэктар ліцэя Міхаіл Міхайлаў. Як паведамляе прэс-служба БАЖ, ён абвесціў газеты "Маладзёжны кур`ер" і "Крычаўлянку" шкоднымі выданнямі, распаўсюд і чытанне якіх ёсць актам непадпарадкавання дзяржаўнай ідэалогіі. Трое з юнакоў, якія мелі дачыненне да распаўсюду выданняў, напалоханыя дырэктарам, сапраўды адмовіліся ад удзелу ў грамадскай справе.

Актуальныя пытанні прасоўвання дзяржаўнай ідэалогіі ў навучальных установах раёна днямі разглядаліся таксама на нарадзе настаўнікаў у раённым упраўленні адукацыі. Начальнік упраўлення Міхаіл Мазок папярэдзіў прысутных (асабліва намеснікаў дырэктараў школ па выхаваўчай рабоце) аб іх персанальнай адказнасці за негатыўныя выказванні ў школах аб прэзідэнце, унутранай і знешняй палітыцы ўлады. Настаўнікам было таксама рэкамендавана даводзіць да вучняў толькі станоўчую інфармацыю аб падзеях у краіне.

**www.charter97.org**

## АДНЫМ РАДКОМ

# ДОЦЕНТА ИЗГОНЯЮТ ЗА ИДЕОЛОГИЮ

АТТЕСТАЦИОННАЯ КОМИССИЯ БРЕСТСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ПРИЗНАЛА ДОЦЕНТА КАФЕДРЫ ФИЛОСОФИИ АНАТОЛИЯ ЛЕВКОВИЧА ПРОФЕССИОНАЛЬНО НЕПРИГОДНЫМ.

Руководителя Брестской областной организации Белорусской социал-демократической партии (Народная Грамада) обвиняют в проповедовании "не той" идеологии, в нелюбви к президенту.



В университете, по рассказу А. Левковича, заседали две аттестационные комиссии, которые рассматривали вопрос о профпригодности доцента. И обе пришли к выводу о полной профессиональной непригодности А. Левковича, который работает в университете уже четверть века.

Но для аттестационных комиссий это обстоятельство не помешало вынести отрицательный вердикт. "Аттестационная комиссия поставила мне в вину политическую деятельность. Спрашивали у меня, пропагандирую ли я социал-демократические идеи во время преподавания философии, на что я ответил: нет, это запрещено законом. Больше никаких вопросов о профессиональной деятельности мне не задавали", — рассказал А. Левкович.

Дважды кафедра философии давала аттестационным комиссиям "положительные характеристики" на преподавателя. Но даже это обстоятельство на аттестующих не оказало влияния.

"Мне сказали, что я не ту идеологию проповедую, не уважаю президента", — рассказывает преподаватель. На второй комиссии ректор поставил в вину А. Левковичу то обстоятельство, что "я мало занимаюсь научной деятельностью — не пишу докторскую диссертацию". "Но я — кандидат философских наук, у нас на кафедре работают академики, профессора в статусе кандидатов наук, а то и вообще люди без научных степеней. Более того, писать или не писать докторскую диссертацию — сугубо личное дело", — считает А. Левкович.

Копии обоих протоколов аттестационных комиссий, где черным по белому доцента обвиняют в политической деятельности, преподавателю взять не удалось. Точку в судьбе опального преподавателя должен поставить ректор.

Теперь возможны три варианта: А. Левкович остается на прежнем месте в прежней должности, его понижают в должности или увольняют. "Ружье висит на стене, чтобы выстрелить. Это чисто политическое решение, поскольку устанавливается запрет на профессию. Вы представляете, что значит быть уволенным из университета по таким мотивам в областном центре: меня не возьмут на работу ни в другой вуз, ни в техникум, ни в школу", — убежден А. Левкович.

"Власть пытается нейтрализовать политически активных лиц, которые могут представлять угрозу на предстоящих парламентских выборах. Она стремится лишить их статуса, чтобы на выборы шли безработные. А как к безработным относятся избиратели — говорить не стоит", — считает председатель БСДП (НГ) Николай Статкевич.

**Белорусский рынок**

# АБЯЦАНКІ–ЦАЦАНКІ

СУСВЕТНАЯ ТЭХНАЛАГІЗАЦЫЯ. НАВАТ ВА УНІВЕРСІТЭЦКІХ ІНТЭРНАТАХ УСТАЛЕЎВАЮЦЬ КАМПУТАРЫ З ВОЛЬНЫМ ВЫХАДАМ У ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЕ СЕЦІВА.

Але прычынай для весялосці гэтая навіна не можа стаць, бо здараецца тое не ў нас, а ў Менску. А універсітэту сталіцы было б сорамна за сваіх студэнтаў, што не могуць выйсці на скарбы сусветных бібліятэк, знайсці тэксты і інфармацыю, што не можа даць не толькі універсітэцкая бібліятэка з прычыны слабога забеспячэння карыснай літаратурай, але і буйнейшая бібліятэка горада.

На сустрэчы рэктара БрДУ Мечыслава Часноўскага са студэнцтвам, што адбылася напрыканцы лістапада ў інтэрнаце на вул. Леніна, абмяркоўваліся больш простыя і надзённыя пытанні, без вырашэння якіх жыццё пераходзіць ва ўмовы нечалавечыя.

У першую чаргу задавалі пытанні пра забеспячэнне інтэрната цёплай вадой. Як адзначыў Мечыслаў Эдвардавіч, гэтае пытанне не залежыць ад кіраўніцтва ўніверсітэта, бо, з прычыны асаблівага становішча ў краіне, вада насельніцтву ў розныя прамежкі часу падаецца з рознымі тэмпературамі. І сапраўды, адчыніўшы кран адзін раз, сустрэнем ваду даволі гарачую, у другі – ваду, якую назваць гарачай змажа толькі чалавек з буйнай фантазіяй.

Праблему душаў на гэтай сустрэчы не ўздымалі, бо абсталяванне хоць і старое, ды яшчэ працуе. Можна было б закрануць зусім невырашальнае пытанне – аб павелічэнні колькасці жаночых душавых. Бо дзяўчаты, каб адчуць на сабе ўздзеянне адной з выгод цывілізацыі, вымушаны чакаць у чарзе ці не гадзіну.

Праблема прывесці свой выгляд у належны стан, гэта значыць дзесьці вымыць і, самае галоўнае, чаго няма ў наяўнасці, дзесьці высушыць сваё адзенне, стаіць вельмі востра. Нашае кіраўніцтва гэтае пытанне не ўсхвалявала: ёсць жа ў інтэрнатах пралка і сушылка. Ніхто чамусьці не адзначыў, у якім гэта ўсё стане. Пралка ў выглядзе ванны – нічога, вымыць адзежыну можна, ды сушылка эпохі неаліту, у якой хіба толькі робы сушыць, а не нармальнае адзенне.



**Чарга ў душавую. У гэты дзень (9 снежня) на «ленінцы» не было гарачай вады, таму яна такая маленькая.**

Каб зняць напружанасць пасяджэння, на якое, дарэчы, склікалі людзей прымусова, сп. Часноўскі сам узняў пытанне пра стварэнне пакоя для палільшчыкаў ва універсітэце, ува што абяцаў укласці 5 млн. руб (скіравалі б тыя грошы на што-небудзь карыснае).

Напрыканцы сустрэчы рэктар паабяцаў паставіць у чытальнай залі інтэрната (што на вул. Леніна) ксеракс. Неабходнасць у гэтым апараце адчуваў кожны, хто хоць раз рыхтаваўся там да заняткаў. Пра кампутары з выхадам у інтэрнэт размовы не было.

Пад задаволены гоман аўдыторыі (электарата) пасяджэнне было закрыта.

Што ж, не блага наша кіраўніцтва ўсіх узроўняў засвоіла прынцып: абяцанкі – цацанкі, а студэнту радасць. Так і кіруюць, адцягваючы ўвагу ад актуальнага і так патрэбага ў жыцці нейкімі каляровымі марамі, нівеліруючы канфлікт.

Пасяджэнне скончылася, дзяўчаты пабеглі ў свае пакоі, хлопцы пабеглі да дзяўчат. Ніякія праблемы не спыняць жыццё!..

**P.S.** Наведваючы з інспекцыяй інтэрнат на Рэчыцы, кіраўніцтва універсітэта заўважыла ў кухні аднаго з паверхаў шмат смецця. І каб у наступны раз больш сачылі за парадкам, загадала зняць пліты, на якіх неахайнае студэнцтва гатавала ежу.

**СУМЛЕННЕ**

# СУСТРАКАЕМ КАЛЯДЫ!

СВЯТА КАЛЯД – АДНО З ТЫХ САМЫХ СВЯТАЎ, ЯКІЯ ЎВЕСЬ ХРЫСЦІЯНСКІ СВЕТ ЧАКАЕ З АСАБЛІВАЙ РАДАСЦЮ І СТАРАЕЦЦА СУСТРЭЦЬ НАЙБОЛЬШ УРАЧЫСТА. ГОРАД І ВЁСКА, СТАРЫ І МАЛЫ – УСЕ РЫХТУЮЦЦА СУСТРЭЦЬ СВЯТА ЯК МАГА ЛЕПШ, АЛЕ Ў ГОРАДЗЕ ГЭТА НЕ ТАК ПРЫКМЕТНА, ЯК У ВЁСЦЫ.

У вёсцы падрыхтоўка да свята пачынаецца аж з першага тыдня посту і скончваецца Куццёй – дзень напярэдадні Каляд. Назву гэту ён атрымаў ад стравы, якую абавязкова гатуюць у гэты дзень і падаюць на стол.

На Куццю гатуюць і багата іншых страў, але самая галоўная з іх – куцця. Яе гатуюць з раніцы. Як толькі зойдзе сонца, уся сям'я апранаецца пасвяточнаму, стол засцілаецца сенам і накрываецца белым абрусам. Пасля малітвы садзяцца за стол, п'юць спачатку гарэлку, а потым падаецца ежа ў такім прыблізна парадку: селядцы з алеем, боршч з грыбамі, рыба, пампушкі, кісель і, нарэшце, куцця. Бліжэй да вечара ходзяць каляднікі.

Звычай калядаваць існуе ў нашым народзе спрадвеку і заключаецца ў тым, што моладзь і мужчыны сярэдніх гадоў збіраюцца асобнымі групамі, бяруць з сабою зорку, гармонік і бубен, і, пераходзячы з хаты ў хату, спяваюць песні, выказваюць сваю добразычлівасць і віншаванні гаспадару.

Падышоўшы да хаты, калядоўшчыкі прыпыняюцца каля акна і хто-небудзь з іх пытаецца ў гаспадара: "Дзядзька, ці кажаш спяваці, ці так каляду дасі?"

Калі гаспадар дазваляе, то пачынаюць спяваць:

### ЯК ПАЙШЛА КАЛЯДА...

Як пайшла Каляда
Упярод Ражства,
Каляда, Каляда!
Прынесла ж Каляда
Рэшата бліноў,
Рэшата бліноў,
Берасцень мёду.
Дзеткі блінамі
У мёд макалі,
У мёд макалі,
Каляду ўспаміналі.

### НА НОВАЕ ЛЕТА...

На новае лета
Радзі, Божа, жыта,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Жыта, пшаніцу,
Усяку пашніцу.
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Дай табе, Божа,
Пане гаспадару,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!
Піва варыці,
Сынкоў жаніці,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Гарэліцу гнаці,
Дачок аддаваці,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Залезь на баляску
І дастань каўбаску,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Стань на драбінку
І дастань саланінку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Кошычак маку
Да таго прысмаку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!



**Змітрок-калядоўшчык. Фота С. Бахуна**

Пасля песні скарбнік падыходзіць да гаспадара з пажаданнем, той у адказ павінен даць грошы ці пачаставаць калядоўшчыкаў, і скарбнік на развітанне гаворыць: "Каб за год даждалі!"

Адпусціць калядоўшчыкаў без нічога не кожны гаспадар адважыцца, інакш яны нагавораць яму вострых жартаў, могуць забраць веніка ці зняць градуснік, а калі гаспадар зачыніўся і нікога не пускае ў свой двор, то калядоўшчыкі, шчэ лепш, здымуць веснічкі і занясуць іх метраў за сто.

Абышоўшы такім чынам сваю вёску, калядоўшчыкі збіраюцца ў адной хаце і "апрыходваюць" сабраныя прадукты і гарэлку, а ўтаргаваныя грошы дзеляць паміж сабою.

**Мікола СІМАНОВІЧ**

# ШЛЯХАМІ ПРЭЗІДЭНТА

НЕЯК НА ДНЯХ МНЕ НЕЧАКАНА ПАШЧАСЦІЛА: СЯБРОЎКА ПРЫНЕСЛА АРЫКУЛ З ГАЗЕТЫ "АРГУМЕНТЫ И ФАКТЫ". Я, КАНЕШНЕ, АМАТАР ЗБІРАЦЬ РОЗНЫЯ ОПУСЫ І КУР'ЁЗЫ, АЛЕ ТОЕ, ШТО ДАВЯЛОСЯ МНЕ ПРАЧЫТАЦЬ... ДЫ ШТО ТУТ КАЗАЦЬ, ЧЫТАЙЦЕ САМІ: "ГОМЕЛЬСКОЕ ПРЕДСТАВИТЕЛЬСТВО "БЕЛИНТУРИСТ" РАЗРАБОТАЛО ЭКСКУРСИОННЫЙ МАРШРУТ ДЛЯ ШКОЛЬНИКОВ, КОТОРЫЙ ВКЛЮЧАЕТ ПОСЕЩЕНИЕ "МАЛОЙ" РОДИНЫ ПРЕЗИДЕНТА БЕЛАРУСИ... В ПРОГРАММУ ВКЛЮЧЕНО ПОСЕЩЕНИЕ ОРШАНСКОГО РАЙОНА... ТОЧНЕЕ ДЕРЕВНИ КОПЫСЬ, ГДЕ И РОДИЛСЯ АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО. КРОМЕ ТОГО... ПЛАНИРУЕТСЯ ПОКАЗЫВАТЬ ДОСТОПРИМЕЧАТЕЛЬНОСТИ ШКЛОВА И МОГИЛЕВА".

Вось і дачакаліся: на Беларусі будзе створана сваё "Залатое кальцо"! Амаль як у фільме "Каралева бензакалонкі": "Паглядзіце направа: перад вамі старажытнейшы помнік беларускага дойлідства і архітэктуры – метраполіс Шклоў. Паглядзіце налева: перад вамі Копысь-City, мястэчка, дзе з'явіўся на свет маленькі Саша. Прыглядзіцеся, калі ласка, уважліва да будынку незвычайнай канструкцыі са шкла і металу у цэнтры дзярэўні – гэта чарговы лядовы палац на душу насельніцтва, на месцы якога раней знаходзіліся рэшткі нейкага напаўразбуранага хлява (ну а як яшчэ можна назваць пабудову не са шкла і металу, а з нейкіх архаічных цаглінаў?), які па віне архітэктараў, падкупленых "адмарозкамі" з апазіцыі, быў памылкова аднесены да пачатку XVI стагоддзя. Менавіта на рэштках гэтага хлеўчыка падлетак Саша разам са сваімі сябрукамі..."

Стоп! Тут асабіста мне хацелася б пералічыць, што могуць рабіць падлеткі на рэштках замчышча, але ж гэта будзе ісці "в разрез с государственной идеологией", ды й яшчэ прыплятуць "оскорбление особы президента". Таму, каб выхоўваць нашу разбэшчаную амерыканскімі далярамі ды макданальдсамі моладзь, я прапанаваў бы наступны працяг экскурсіі:

"... дзе падлетак Саша... раздаваў бясплатна прыгонным сялянам хлеб, які ён разам са сваімі сябрамі адбіраў у буржуяў. Саша вырас у беднай сялянскай сям'і, таму ён з дзяцінства ведаў, якой цяжкай працай дастаецца гэты духмяны бохан, што кожнай раніцай з'яўляецца на стале ў прыгнятальнікаў простага народа: настаўнікаў, дактароў, творчай інтэлігенцыі, карацей, усіх тых паноў, якія не жадаюць кожнае лета ездзіць на сенанарыхтоўкі і восеньскія бульбакапанні...".

А што, зусім нават нядрэнна атрымліваецца! Так бы мовіць, і прыгожа, і пра прэзідэнта. А для прадстаўнікоў АБСЕ ды ААН уздоўж аўтатрасы "Залатога кальца" будуць створаны ідылічныя карціны наступнага характару: мужчына сталага ўзросту, апрануты ў чорны ў белую палоскуаднабортны касцюм-тройку з гальштукам колеру бардо (па ўсім відаць – індывідуальны прадпрымальнік), з непрытоенай асалодай махае касой "дзевяткай" і, хутчэй за ўсё, прыгадвае нешта з І. Мележа, накшталт: "Хто сказаў, што ён яшчэ малы касіць?..." Або відовішча іншага плану: нядзеля, ля вялізнага поля, парослага пажоўклай лебядой і бульбоўнікам, стаіць група дзяцей. Злосны капіталіст-абаронца правоў чалавека, не хаваючы радасці, кідаецца да дзяцей з рознымі антысавецк..., прашу прабачэння, антыпрэзідэнцкімі пытаннямі, але, кажучы на мове падлеткаў, атрымлівае аблом. Аказваецца, дзеці паслухаўшы на тыдні селектарную нараду, даведаліся, што да нацыянальнага свята Дажынкі краіна не паспявае выкапаць бульбу, таму і сабраліся ў выходны, каб выканаць план.



Дажынкі-2000 у Шклове. Ідылія на фоне галечы. Фота: ByMedia.net

Вось такая магла б атрымацца экскурсія. Дарэчы, пакуль што прадстаўнікі берасцейскіх турыстычных фірм да такой геніяльнай ідэі не дадумаліся.

**P.S.** Асабіста я з вялікім задавальненнем праехаўся б па вышэй азначаным маршруце, калі б апошнім пунктам падарожжа была Гаага.

**К. Усто**

# ВЫКЛЮЧИ МОБИЛЬНИК. ЗА ТОБОЙ СЛЕДЯТ

ПО РЕШЕНИЮ МЕЖВЕДОМСТВЕННОЙ КОМИССИИ ПО БОРЬБЕ С ПРЕСТУПНОСТЬЮ, КОРРУПЦИЕЙ И НАРКОМАНИЕЙ ПРИ СОВБЕЗЕ, МИНСВЯЗИ ВОЗЬМЕТ ПОД ПОСТОЯННЫЙ КОНТРОЛЬ МОБИЛЬНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ, РАБОТАЮЩИЕ В ОТЕЧЕСТВЕННЫХ СЕТЯХ СОТОВОЙ СВЯЗИ.

Заявленная цель — поиск похищенных аппаратов и предупреждение новых краж. Однако подобное нововведение позволяет значительно больше. К примеру, можно отслеживать перемещение абонентов от одного оператора к другому, вычислить все незаконно ввезенные в страну аппараты, быстро обнаружить местонахождение конкретного человека и проследить его телефонные контакты.

Каждый мобильный телефон имеет уникальный номер — IMEI (International Mobile Equipment Identifier), состоящий из 15 цифр, который устанавливается при изготовлении и служит для точной и полной идентификации устройства в сети. Включенные телефоны (в режиме разговора и ожидания) постоянно посылают сигнал, в т.ч. и свой IMEI, на ближайшую базовую станцию. Это своеобразная метка телефона и соответственно его владельца: куда бы он ни пошел, телефон практически ежесекундно сообщает о своем положении. Местонахождение человека с искомым телефоном можно определить с точностью до 30 м. Только если телефон отключить, оператор зарегистрирует его как находящийся вне сети.

**Справка:** Номер IMEI легко можно узнать, набрав на своем телефоне в режиме ожидания код *#06#.

## НЕТ СМЫСЛА КРАСТЬ "МОБИЛУ"?

Специалисты считают, что для операторов не составит большого труда создать спецгруппу, отслеживающую IMEI номера телефонов. Но, несмотря на то, что Минсвязи рекомендовало операторам до 15 ноября представить свои соображения по обеспечению на постоянной основе контроля за IMEI номерами абонентов, к намеченному сроку они выработаны не были.

Между тем, кражи мобильных телефонов выходят в лидеры среди преступлений. А контроль за серийными номерами мобильников действительно способен полностью лишить смысла кражи аппаратов. Получив заявление о похищении мобильного телефона, оператор может его просто заблокировать (имея соглашение о сотрудничестве и общую базу похищенных мобильников, заблокировать заявленный телефон смогут оба GSM-оператора). А неработающий телефон злоумышленник не сможет перепродать.

## ПРИВЕТ ОТ БОЛЬШОГО БРАТА

Контроль за IMEI мобильных телефонов открывает в перспективе большие возможности. Например, для отслеживания перетекания абонентов от одного оператора к другому. При наличии общей базы серийных номеров мобильников сразу видно, к какой сети, Velcom или МТС, подключен его владелец.

Подобный контроль в принципе дает возможность жесткого регулирования импорта мобильных аппаратов. Как известно, процедура ввоза мобильных телефонов весьма сложна: их нужно сертифицировать и регистрировать, все это хлопотно и дорого. Поэтому многие поставщики обходят ее стороной. Объем "серого" рынка мобильных телефонов стабильно остается в пределах 75-80% от общего количества ввезенных в Беларусь аппаратов. Если учесть, что формально регистрацию радиоэлектронных средств (РЭС) никто не отменял, Госинспекция по электросвязи имеет право потребовать зарегистрировать все телефоны, не прошедшие эту процедуру, пригрозив отключением. В этом случае около 700-750 тыс. абонентов должны потратить несколько часов своего времени и заплатить по $2 за каждый регистрируемый аппарат — т.е. в воздухе (а точнее, в радиоэфире) зависли примерно $1,5 млн.!

Для контроля за лицами, которых разыскивают спецслужбы, мобильник также может быть незаменим. Передавая сигнал на базовые станции, телефон указывает местоположение своего владельца с точностью от 100 до 30 м. Более того, мобильник способен не только "навести" на своего владельца, но и "рассказать" заинтересованным службам, с кем и когда он общается, разговаривает по телефону и даже лично.

Кстати, опыт организации слежки через мобильник распространен и в Европе. Осенью текущего года финские законотворцы предложили на рассмотрение парламенту новый закон, согласно которому родителям разрешается следить за передвижениями своих детей при помощи их мобильных телефонов. В чрезвычайных ситуациях за людьми можно будет по-прежнему следить без их согласия, независимо от возраста.

**БЕЛОРУССКАЯ ГАЗЕТА**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 10 СНЕЖНЯ

10 снежня 1948г. Генеральная Асамблея ААН зацвердзіла і абвясціла **Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека.** Асамблея звярнулася з заклікам да ўсіх дзяржаў – сяброў ААН – абнародаваць тэкст Дэкларацыі і зрабіць усё магчымае для «яе распаўсюджвання, абвяшчэння і растлумачэння, галоўным чынам у школах і іншых навучальных установах»...

### 11 СНЕЖНЯ

11 снежня 1876 г. на Смаргоншчыне нарадзіўся кампазітар **Мечыслаў Карловіч,** сын славутага этнографа і музыколага Яна Карловіча. Пасля вучобы ў Нямеччыне ён пасяліўся ў Варшаве, дзе заснаваў сімфанічны аркестр, пісаў сімфоніі. Паводле прызнання самога М.Карловіча, ён з дзяцінства любіў беларускія песні і матывы іх шчодра ўключаў у свае творы. Асабліва гэта адчуваецца ў трыпціху "Адвечныя песні" і ў "Літоўскай рапсодыі". Сёння гэтыя творы ёсць у рэпертуары сімфанічнага аркестра Беларускага радыё і тэлебачання.

### 21 СНЕЖНЯ

21 снежня 1796 г. нарадзіўся **Тамаш Зан**, культурны герой беларускай мінуўшчыны. ¨н скончыў Менскую гімназію і Віленскі універсітэт. Тамаш Зан – адзін з заснавальнікаў таварыстваў філаматаў і філарэтаў, ён сябраваў з Адамам Міцкевічам, Янам Чачотам. За антырасейскую дзейнасць быў сасланы ў Арэнбург амаль на дваццаць гадоў. Праўда, яму пашчасціла адтуль вярнуцца і ўжо да канца дзён жыць на Радзіме.

### 22 СНЕЖНЯ

22 снежня 1925 г. Віленшчына была перайменаваная ў **Віленскае ваяводства.** Такім чынам, край рабіўся адміністрацыйнай адзінкай польскай дзяржавы. Канфліктная тэрыторыя была захопленая войскам генерала Жалігоўскага яшчэ ў 1920г., але гэтага захопу не прызналі многія краіны свету, і таму статус Віленшчыны цэлых пяць гадоў быў неакрэслены. І вось, у 25-м было створана Віленскае ваяводства, якое будзе існаваць да 1939г., калі Польшчу падзеляць паміж сабою сталінская Расея і гітлераўская Нямеччына.


Год V. … № 35.

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

Выходзіць што тыдзень рускімі і польскімі літэрамі.

А вось што пісалі 22 снежня 1913 г. у **"Нашай Ніве"**: "Апошні месяц году – самы свабодны ў гаспадарцы, дык хай кожны стараецца зарабіць крыху грошай – з канём ці з сякерай у лесе. Бабы хай ачысцяць і выбеляць хату перад вялікім святам – Калядамі; дзецюкі прыпомняць песні, якія пяялі іх бацькі і дзяды на Каляды і як гулялі з "кабылай", "казой" ці "мядзьведзем". Вось яшчэ адна вытрымка: "Кожны беларус павінен рупіцца, каб у старшыні, у старасты выбіралі найлепшых, найбольш справядлівых людзей. Памылка людзей у тым, што яны шукаюць шчасця на чужым шляху замест таго, каб шукаць на сваім". Так пісаў каляндар "Нашай Нівы" ў 1913 г.

### 24 СНЕЖНЯ

У 1784г. нарадзіўся **Зарыян Даленга-Хадакоўскі** – даследчык гісторыі і мовы. ¨н скончыў каталіцкае вучылішча ў Слуцку. Даленга-Хадакоўскі быў самым першым беларускім археолагам – яшчэ ў 1818г. ён атрымаў дазвол Віленскага універсітэта на раскопкі і пачаў вывучаць старажытныя курганы. Яго моцна цікавіла паходжанне роднага народа, рассяленне старажытных плямёнаў, іхні побыт і культура. А яшчэ ў часе экспедыцый Даленга-Хадакоўскі збіраў і запісваў народныя песні.

# АД МАЛОГА ДА ВЯЛІКАГА – «СТАНАЎЛЕННЕ»

## МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ

ВЯДОМЫЯ БЕЛАРУСКІЯ СЫНЫ УЛАДЗІМІР КАЛЕСНІК, МІКОЛА ПРАКАПОВІЧ, АЛЕСЬ КАСКО НЕКАЛІ ТАКСАМА ПАЧЫНАЛІ СВОЙ ТВОРЧЫ ШЛЯХ З САМАГА ПРОСТАГА. А МЕНАВІТА – З УНІВЕРСІТЭЦКАГА ЛІТАРАТУРНАГА ГУРТКА "СТАНАЎЛЕННЕ". АЛЕ ЧАС НЕ СТАІЦЬ НА МЕСЦЫ, З КОЖНЫМ ДНЁМ РУХАЕЦЦА І ЗМЯНЯЕЦЦА, ЯК ЗМЯНЯЕМСЯ І МЫ.

Уладзімір Калеснік, на жаль, пакінуў гэты свет… А месца "працы" Міколы Пракаповіча і Алеся Каско змянілася – зараз гэтыя людзі – сябры Беларускага саюза пісьменнікаў і ніякага дачынення да "Станаўлення" не маюць. Але, нягледзячы на тое, што яны спынілі сваю дзейнасць у "Станаўленні", яно жыве і зараз знаходзіцца ў стане адраджэння і развіцця.

Так, 19 кастрычніка 2002 года адбыўся першы збор літаратурнага гуртка "Станаўленне", адраджэнцамі якога сталі трое маладых людзей: Мікола Сімановіч, Сяржук Гаўрыленка і Андрусь Ляўчук – студэнты філфака БрДУ.

На пачатку гэта было простае чытанне вершаў адзін аднаму, але пасля да нас далучыліся яшчэ людзі. Людзі, неабыякавыя да беларускай мовы і якія таксама хочуць, каб святыня беларусаў сапраўды ёю і была. Хочуць, каб яе памяталі, любілі і адраджалі яе ў першаснай красе, на народнай аснове.

У кастрычніку нашаму гуртку споўніўся 1 год, але наперадзе ў нас яшчэ шмат "дзён народзінаў", і нас чакае вялікая праца, бо мы маем шмат задум на будучае. Па-першае, мы жадаем наладзіць свой перыядычны друк; па-другое, у нас ёсць план выпусціць свой альманах, які будзе змяшчаць і гісторыю, і нашыя новыя здабыткі, і нашу творчаць; па-трэцяе, і, напэўна, самае галоўнае, мы не збіраемся пакідаць родную мову, а будзем ісці толькі наперад і толькі з такімі словамі: "Я – Беларус! Я размаўляю па-беларуску! Я люблю роднае і не пакіну яго!"

Усім чытачам шчыра зычу вялікіх поспехаў і натхнення, запрашаю наведваць нашыя літаратурныя вечарыны і прапаную прачытаць некалькі вершаў нашых сябраў.

**Мікола СІМАНОВІЧ,**
**кіраўнік літаратурнага гуртка "Станаўленне"**







### *ГАЎРЫЛЕНКА СЯРЖУК*

**Эпітафія каханню**

**К**аханне… ¨сць ці не – каханне?
**А**ле ж… Няма яго на свеце.
**Х**аця… Ад вечара да рання?..
**А**т… Рысачка ў жыцця сюжэце.
**Н**яма яго ў траве высокай.
**Н**яма – у цемрадзі кватэры.
**Я**но памерла. Ужо не крыкне:
**–** Двуногія, мяне – за дзверы?!..
**Н**е. Не адкрылі. Не пачулі.
**Я**го стаўклі ў "любоўным" брудзе…
**М**аліцеся, сышло каб з крыжа –
**А** не пад крыж – Каханне… Людзі…

***

**Палянэз**

Мэлёдыя з бара па вуліцы
Хмельнай
Бадзягай лунае
па Старай Варшаве.
Узгадка былое ліцьвінскае славы –
Мэлёдыя з бара па вуліцы
Хмельнай.
Паўзе задуменьне
трывожным пахмельлем,
Бо сум па Айчыне віном –
не разбавіць…
Мэлёдыя з бара па вуліцы
Хмельнай
Бадзяжна лунала
па Старай Варшаве.

### *КАМІНСКІ СЯРЖУК*

Навошта сэрцу трэба
І час жніва, і неба,
Зямлі вільготны пах;
Навошта сэрцу трэба
У небе белы птах,
Вайны смяротны жах,
Навошта сэрцу трэба,
І час жніва, і неба?

***

Новы ранак
Час аспрэчыў,
Запярэчыў
Харастcovered;

Хоць прыветна
Ня быў узняты
І заняты
Сэрца гром;

Другім разам…
Праляцела,
Не глядзела
Сёння ты…

Я сумленны,
Пачакаю,
Бо не знаю –
Слепаты!..

### *СІМАНОВІЧ МІКОЛА*

Летняя ночка весела над намі
На бераг Гарыні выйшлі
мы з Вамі…
Ціха бруіліся водныя далі.
Пад месяцам поўным
паблiсквалі хвалі,
І босыя ногі тваё абдымалі,
Як бы дзіцё, яны забаўлялі.
Часам вадою ў далоні пліскалі.
Так ужо прыгожа з табою гулялі.

Вербы старыя штосьці шапталі,
Мне падалося – песню спявалі.
Вецер імкліва ў косах гарцаў,
Тут ён, гарэза, вершы складаў.
Бывала раптоўна ўверх падрываў.
Мне зразумела – ён раўнаваў...
Я не без справы таксама стаяў:
Хоць і ціхенька, але ж кахаў.

***

Не варта траціць на каханне
Душы сваёй усе ўспаміны;
Забыць што ёсць вакол
дзяўчыны…
Не варта траціць на каханне
Сваё жыццё, сваё рыданне…
Аж да апошняе хвіліны
Не варта траціць на каханне
Душы сваёй усе ўспаміны.

# ПРА КАХАННЕ І НЕ ТОЛЬКІ

*Такія месцы проста так не пакідаюць...*
*Зміцер Бартосік*

УСЁ НІЖЭЙ НАПІСАНАЕ МАЕ ВЫКЛЮЧНА АЗНАЯМЛЯЛЬНЫ (ЧЫТАЦЬ: АБУДЖАЛЬНЫ) ХАРАКТАР І НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕ ПРЭТЭНДУЕ НА МЕСЦА Ў ЭПІСТАЛЯРНАЙ СПАДЧЫНЕ. ХУЧЭЙ ЗА ЎСЁ, ДАДЗЕНЫЯ РАЗВАЖАННІ ТРЭБА РАЗГЛЯДАЦЬ У ЯКАСЦІ СУБ'ЕКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ АМАТАРА-ПАДАРОЖНІКА, ЯКІ Ў ВЫНІКУ ЗБЕГУ АКАЛІЧНАСЦЯЎ АПЫНУЎСЯ Ў ДОБРЫМ МЕСЦЫ, АЛЕ Ж У НЕ АДПАВЕДНЫ ДЛЯ ГЭТАГА ЧАС.

Спяшаюся адказаць на Вашае пытанне, шаноўны чытач, ды паставіць кропку ў свавольным радку здагадак і асацыяцый – далейшыя запісы прысвячаюцца згубленай Меццы беларусаў – Вільні.

Мацёрым падарожнікам мяне назваць нельга: з гарадоў бліжняга замежжа некалькі разоў давялося пабываць толькі ў Польшчы (пераважна ў Варшаве). На гэтым можна было б паставіць кропку ў маіх вандраваннях па навакольным свеце, калі б па іроніі лёсу не давялося сутыкнуцца з Вільняй. На першы погляд нічога асаблівага няма, нават наганяе сум (чытаць: незразумелае хваляванне), таму як пераважная большасць гораду несвядома нагадвае родны і знаёмы да болю Менск: тыя ж "штампавыя" шматпавярховікі, з вузкімі аўтастрадамі-тратуарамі, што вядуць ад танэляў пад'ездаў да аўтобусных прыпынкаў; тыя ж людзі з тыпова славянскімі (чытаць: беларускімі) рысамі твару: ільняныя валасы ды светлыя вочы; тыя ж аўтамабілі...


**Вільня. Вострая Брама. Месца, дзе павінен пабываць кожны беларус. Фота: ByMedia.net**

Я адкрыў для сябе Вільню, якую наўрад ці можна пакахаць з першага позірку (нягледзячы на тое, што здольнасць закахацца з падобнай хуткасцю – гэта мая "хвароба". Колькі ўжо разоў было: першы раз бачу дзяўчыну, ну ЛІТАРАЛЬНА ПЕРШЫ, вось толькі паспеў абмовіцца з ёю некалькімі фразамі – і гатовы за яе хоць на вогнішча, хоць у пятлю!). Вільню ж можна параўнаць толькі з жанчынай, глыбіню сваіх пачуццяў да якой асэнсоўваеш тады, калі побач з табою знаходзіцца іншая.

Я не люблю восень, асабліва з яе туманамі ды дробным дажджом, можа таму менавіта позняй восенню абвастрылася туга па страчаным каханні, па страчанай згубе, па страчанай Меццы беларускага народа – па страчанай (чытаць: няхай і не па тваей віне, але ж СТРАЧАНАЙ) Вільні.

Вільню мы згубілі даўно, яшчэ ў 1939 г., калі "бацька і правадыр усяго савецкага народу" І. Сталін перадаў яе разам з Віленскім краем Літве. Саўдэпаўскае кіраўніцтва, ведаючы пра брыду свайго ўчынку, вуснамі Молатава заявіла: "Мы ведаем, што большасць насельніцтва гэтага абшару не літоўская. Але гістарычнае мінулае ды імкненні літоўскага народа цесна звязаны з горадам Вільня, і ўрад СССР уважаў за неабходнае шанаваць гэтыя маральныя фактары". Ну, а далей усё пайшло па знаёмаму для беларусаў сцэнару: беларускамоўныя школы пачалі зачыняцца (сардэчны "дзякуй" за гэта літоўскаму міністру асветы Ю.Жыжгудзе), пачалося татальнае перасяленне жамойтаў (на сучасным этапе гэта тыя, хто прысвоіў назву "літоўцы") на этнічныя беларускія землі, не абышлося, канешне ж, без нацыянальнай дыскрымінацыі і г.д.

Трэба дадаць, што мы, беларусы, маем па гэтай частцы даволі багаты вопыт: апошнім часам неяк стала модна казаць пра польскі шавіністычны рух на тэрыторыях Беларусі на працягу XVII-XVIII, і ўсё папулярней сталі размовы (асабліва апошнія год дзесяць) пра славянскае адзінства (тут нават пошла, ведаеце, размаўляць пра трохсотгадовую акупацыю ды МІЛЬ¨НЫ ахвяраў імперыялістычных "великорусских" памкненняў кацярынаўшчыны ды саўдэпаўшчыны). Пасля Другой Сусветнай вайны сітуацыя з межамі беларускіх зямель не змянілася.

Існуе нават версія, па якой падзел межаў адбыўся наступным чынам. Літоўскі пісьменнік Юстас Палецкіс, які ўдзельнічаў у дэлегацыі на прыёме ў Сталіна, у адным з інтэрв'ю паведаў: "Калі ў 1944г. пасля выгнання немцаў паўстала пытанне аб дзяржаўных межах паміж БССР і ЛССР... доўга меркавалі пра лёс Вільні і баяліся, што яна нам не дастанецца. Бо ведалі, што Беларусь вельмі пацярпела ў вайне і там вельмі актыўна змагаліся з немцамі, тым часам як у нас усё было не так. Сядзім, маўчым да нейкага часу. ¨н, Сталін, і кажа: "Ну, што вы тут мяркуеце?" Мы муляемся, не адважваемся сказаць. А ён гаворыць: "Я думаю, што мяжа павінна прайсці, ну... вось так", – і пазногцем правёў на карце. Тады мы ўзрадваліся з палёгкай (Вільня з нашага боку!)..."

Вось так, шаноўны чытач, мы і страцілі СВАЮ Вільню. Можна, канешне, казаць, што каханне прайшло і, маўляў, нават і не было таго сапраўднага пачуцця (мабыць, гэтымі ж словамі супакойваў калісьці сябе і я), толькі трэба дадаць, што самога сябе, мае шаноўныя, не падманеш, асабліва позняй восенню, калі туманы разбаўляюць тваю каву замест вяршкоў ды дождж грукае познім спадарожнікам у вакно на кухні.

**Эпіграф артыкула ўзяты з песні З.Бартосіка "Развітанне з Вільняй". Гістарычны матэрыял пераасэнсаваны з кнігі "150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі".**

**Падарожнік-аматар**
**Андрэй ЛЯЎЧУК**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 24 СНЕЖНЯ

4 снежня 1798г. нарадзіўся яшчэ адзін наш зямляк – вялікі паэт **Адам Міцкевіч**, аўтар славутай паэмы "Пан Тадэвуш". З'явіўся на свет Адам Міцкевіч на хутары Завоссе каля Навагрудка. У Навагрудку скончыў школу і паступіў у Віленскі універсітэт. І пачалося ягонае багатае на падзеі жыццё. Адам Міцкевіч надта любіў і цаніў беларускую мову. У сваёй лекцыі ў Калеж-дэ-Франс у Парыжы ён назваў беларускую мову самай гармонічнай і з усіх славянскіх моваў найменш змененай. Праўда, пісаў свае вершы Міцкевіч папольску, бо пальшчызна ў ягоны час была прызнанай літаратурнай мовай, а беларушчына заставалася доляю фалькларыстаў і этнографаў.


**А.Міцкевіч.** З партрэта Я.Аляшкевіча.

### 27 СНЕЖНЯ

24 гады таму пакінуў гэты свет **Антон Антановіч**, віленскі беларускі навуковец, які сваю кар'еру прысвяціў вывучэнню ўнікальных помнікаў пісьма – аль-кітабаў. Гэта кнігі беларускіх татар-мусульманаў XVII ст., якія пісаліся па-беларуску арабскімі літарамі. Дзякуючы аль-кітабам мовазнаўцы маюць магчымасць вывучаць асаблівасці тагачаснага беларускага вымаўлення, якія кірылічныя кнігі не перадавалі. У сваёй манаграфіі "Беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом, і іх графіка-арфаграфічная сістэма" (гэтая кніга выйшла ў Вільні ў 1968 г.) Антановіч даследаваў 24 рукапісныя помнікі татара-мусульманскага пісьменства на беларускай мове. Трэба заўважыць, што так грунтоўна гэтую тэму ў беларускай навуцы даследаваў бадай толькі Антон Антановіч.

### 29 СНЕЖНЯ

29 снежня 1884г. памёр слынны беларускі паэт і драматург **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**. Класік нацыянальнай літаратуры нарадзіўся ў збяднелай шляхецкай сям'і пад Бабруйскам. Разам са сваёй сям'ёй ён браў удзел у паўстанні 1863г. Апошнія гады жыцця правёў пад наглядам паліцыі ў фальварку Люцынка, што каля Івянца. Між іншым, Дунін-Марцінкевіч пераклаў па-беларуску паэму Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш". А найбольшую славу яму прынеслі п'есы "Ідылія" ("Сялянка"), "Пінская шляхта" і "Залёты".



29 снежня 1989г. **Вацлаў Гавэл** стаў першым некамуністычным прэзідэнтам Чэхаславакіі за апошнія 40 гадоў. Зараз многія беларускія палітыкі згадваюць пра Гавэла. Маўляў, вось бы і нам такога прэзідэнта.

**Гістарычны сектар**

# АБАВЯЗАК КОЖНАГА – БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМ!

ШЧАСЦЕ – ПАЧУЦЦЕ І СТАН ПОЎНАЙ, НАЙВЯЛІКШАЙ ЗАДАВОЛЕНАСЦІ; ПОСПЕХ, УДАЧА. ТАКОЕ АЗНАЧЭННЕ ДАЕ ГЭТАМУ ПАНЯЦЦЮ "ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ" (ПАД РЭД. М. Р. СУДНІКА). АНАЛАГІЧНА ТЛУМАЧЫЦЬ ЯГО І С. І. ОЖЭГАЎ ("ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК РАСЕЙСКАЙ МОВЫ").

«Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы" падае 127 (!) вобразных азначэнняў слова "шчасце": яно бязмежнае, вечнае, моцнае, нечалавечае, гарачае, мужнае, чыстае, дзівоснае, але зменлівае, імгненнае, прывіднае, хісткае, сумнае, горкае, трагічнае, колкае, балючае...

Шчасце. 6 літар. Шча-сце. 6 гукаў. ШЧАСЦЕ – што гэта?

Шчасце – гэта асаблівае радаснае пачуццё, якое ахоплівае нас падчас прыемных хвілін або падчас "любоўнага хвалявання". Сапраўднае шчасце – гэта значна больш, чым проста прыемныя пачуцці. Шчасце – гэта ціхамірнасць, якая ахоплівае нас, калі мы знаходзімся ў сапраўднай згодзе з самім сабой. Гэта страсная рухаючая сіла, якая забяспечвае дасягненне значных мэтаў. Гэта ўсеабдымнае пачуццё, што ўсё добра і жыццё цудоўнае.

Што характарызуе шчаслівых людзей? Яны прабачаюць крыўды, яны аптымістычныя і велікадушныя, не заўважаюць дробных уколаў і з'едлівых заўваг. Сапраўды шчаслівым людзям не прыходзіць да галавы асуджаць іншых за іх расу, узрост, непрывабнасць, фізічныя недахопы, пол або палавую арыентацыю. Яны спакойна прымаюць іншыя пункты гледжання, якія адрозніваюцца ад іх асабістых, праўда, да таго часу, пакуль гэтыя іншыя погляды не прыносяць шкоду, не пачынаюць парушаць правы іншых людзей. Шчаслівы разумее: быць шчаслівым – значыць нічога не даказваць.

Наша ўласнае шчасце з'яўляецца перадумовай для пазітыўнага ўздзеяння на іншых. Чым больш поўным становіцца наша жыццё, тым большы ўплыў мы можам аказваць на тых, хто нас акаляе ў паўсядзённасці. Шчаслівыя людзі настроены на дапамогу тым, хто гэтага патрабуе. Таму шчасце - гэта нешта большае, чым проста эгаістычная мэта.

Пачніце з самага простага – станавіцеся шчаслівейшымі зараз. Пачаць можна так: падыміце куточкі вуснаў угару. Гэта добры пачатак. Нашыя паводзіны ўплываюць на думкі і эмоцыі. Існуе зваротная нервовая сувязь паміж мышцамі твару і мозгам. Напружваючы мышцы твару ва ўсмешцы, мы паляпшаем настрой. Даследчыкі лічаць, што той, хто вядзе сябе, як шчаслівы чалавек, з большай верагоднасцю становіцца ім. Рабіце выгляд, што вы шчаслівыя – і вы сапраўды будзеце шчаслівыя.

Змясціце ўсмешлівыя тварыкі паўсюль, дзе вам гэтага хочацца, – на люстэрках, сценах, тэлефонах, каб яны ўвесь час прыгадвалі вам усмешку.

Удзельнікаў псіхалагічнага эксперыменту папрасілі пабыць у людным месцы з рознымі выразамі твару. На ўсмешку людзі адказвалі ўсмешкай у палове выпадкаў, у той час як на пахмурны выраз твару рэагавалі рэдка.



Залатая восень. Шчаслівая пара. Фота: ByMedia.net

Іншае даследаванне выявіла, што ўсмешлівыя людзі ацэньваюцца партнёрамі як больш шчырыя і выклікаюць больш даверу. Больш таго, пры прыёме на працу перавага, як правіла, аддаецца кандыдатам, што ўсміхаюцца. Усмешлівыя афіцыянты атрымліваюць большыя "чаявыя", а ўсмешлівым кіроўцам даішнікі радзей выпісваюць штрафы.

Шчаслівыя людзі лягчэй знаходзяць сяброў. Чалавечай прыродзе ўласціва імкненне знаходзіцца побач са шчаслівым чалавекам, які прымушае нас адчуваць сябе лепш.

І яшчэ: думайце пазітыўна. Нашыя думкі матэрыяльныя. Тое, пра што вы думаеце зараз, абавязкова споўніцца ў будучым. Будзьце шчаслівыя!

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# ЦІ ЎМЕЕЦЕ ВЫ БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМ?

**1. Калі часам засяроджваецеся на думцы пра пражытае жыццё, ці прыходзіце вы да высновы, што:**
а) усё было хутчэй дрэнна, чым добра;
б) было хутчэй добра, чым дрэнна;
в) усё было выдатна.

**2. У канцы дня звычайна:**
а) незадаволеныя сабой;
б) лічыце, што дзень мог бы прайсці лепш;
в) кладзецеся спаць з пачуццём задавальнення.

**3. Калі глядзіцеся ў люстэрка, думаеце:**
а) "О Божа, час бязлітасны!"
б) "А што, яшчэ зусім нядрэнна!"
в) "Усё выдатна!"

**4. Калі даведаецеся пра буйны выйгрыш каго-небудзь са знаёмых, думаеце:**
а) "А мне ніколі не пашанцуе!"
б) "Ах, чорт! Чаму ж не я?!"
в) "Аднойчы так пашанцуе і мне!"

**5. Калі, да прыкладу, пачуеце па радыё пра якое-небудзь дрэннае здарэнне, кажаце сабе:**
а) "Вось так аднойчы будзе і са мной!"
б) "На шчасце, гэтая бяда мяне абмінула!"
в) "Гэтыя рэпарцёры наўмысна нагнятаюць страсці!"

**6. Калі абуджаецеся раніцай, часцей за ўсё:**
а) ні пра што не хочацца думаць;
б) узважваеце, што рыхтуе вам сённяшні дзень;
в) задаволеныя, што пачаўся новы дзень, і вас чакаюць новыя сюрпрызы.

**7. Думаеце пра вашых прыяцеляў:**
а) "Яны не такія цікавыя і чуйныя, як хацелася б";
б) "Канешне, у іх ёсць недахопы, але ў агуле яны добрыя";
в) "Выдатныя людзі!"

**8. Параўноўваючы сябе з іншымі, лічыце:**
а) "Мяне недаацэньваюць!"
б) "Я не горшы за астатніх!"
в) "Я варты лідэра, і гэта, бадай, прызнаюць усе!"

**9. Калі вашая вага павялічылася на 5-6 кг:**
а) пачынаеце панікаваць;
б) лічыце, што ў гэтым няма нічога асаблівага;
в) тут жа сядаеце на дыету.

**10. Калі вы прыгнечаныя:**
а) праклінаеце лёс;
б) ведаеце, што дрэнны настрой міне;
в) стараецеся развеяцца, развесяліцца.

**КЛЮЧ.**

**Кожны адказ: а – 0 балаў; б – 1 бал; в – 2 балы.**

**0-7 балаў.** Вы прывыклі глядзець на ўсё скрозь чорныя акуляры, лічыце, што лёс прыгатаваў Вам долю чалавека няўдачлівага, нешчаслівага. Старайцеся больш часу праводзіць у кампаніі вясёлых аптымістаў. Добра было б нечым заняцца, знайсці хобі.

**8-12 балаў.** Шчасце і няшчасце выражаюцца для Вас вядомай формулай "50/50". Калі хочаце схіліць вагі на свой бок, старайцеся не пасаваць перад цяжкасцямі, абапірайцеся на сяброў, не пакідайце іх у бядзе.

**13-16 балаў.** Напэўна, Вы "аптымальна" шчаслівы чалавек, і радасці ў Вашым жыцці яўна больш, чым смутку. У Вас цвярозы склад розуму і лёгкі характар. Вы не панікуеце, сутыкаючыся з цяжкасцямі, цвяроза іх ацэньваеце. З Вамі камфортна.

**17-20 балаў.** Вы да таго шчаслівыя, што нават не верыцца, быццам такое магчыма! Радуецеся жыццю, не звяртаеце ўвагі на непрыемнасці і жыццёвыя нягоды. Чалавек Вы жыццярадасны, падабаецеся людзям сваім аптымізмам, але... ці не занадта павярхоўна і легкадумна Вы адносіцеся да ўсяго, што адбываецца? Можа, крыху цвярозасці Вам не зашкодзіць?

**Падрыхтавала Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# ЗАБАРОНЕНАЕ

**СЁЛЕТА СПОЎНІЛАСЯ 20 ГАДОЎ, ЯК З НАМІ НЯМА ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ. У ЗЭЛЬВЕ, ДЗЕ ЯНА ПРАЖЫЛА АПОШНІЯ ГАДЫ, НАМАГАННЯМІ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ГРАМАДСКАСЦІ ЎСТАЛЯВАЛІ ПОМНІК, ЯКІ ЎЛАДЫ ХОЧУЦЬ ЗАРАЗ ДЭМАНТАВАЦЬ, БО УЗГАДНІЦЬ З ІМІ ЗАБЫЛІСЯ, А МЫ ЗВЕРНЕМСЯ ДА ВАЕННАЙ ЛІРЫКІ СЛАВУТАЙ ПАЭТКІ І ПАСПРАБУЕМ АСЭНСАВАЦЬ ЯЕ БАЧАННЕ КРЫВАВЫХ ПАДЗЕЙ 2-Й СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ, ЯКАЯ ПРАЙШЛА ПА НАШАЙ ЗЯМЛІ, НАЗАЎЖДЫ ЗАБРАЎШЫ З САБОЮ МІЛЬЁНЫ ЛЮДСКІХ ЛЁСАЎ.**



Ларыса Геніюш

Тым, хто ў школах "чытае вершы Васіля Быкава" ды "рэзаніруе" аб славянскім адзінстве і братэрстве, безумоўна няма сэнсу прызнаваць відавочны факт: на Беларусі II Сусветная вайна была не Айчыннай, а грамадзянскай. Беларускі народ змагаўся як з нямецкімі акупантамі, так і з расейскімі захопнікамі. І таму, калі гавораць пра калабарацыянізм Геніюш, Арсенневай, Сяднева, іншых выбітных пісьменнікаў, ад якіх адраклася савецкая ды постсавецкая Беларусь, узнікае пытанне: "А як ахарактарызаваць тых "пісьменнікаў", якія ў сваёй творчасці праслаўлялі антычалавечны камуністычны рэжым і маскоўскіх акупантаў?" Адказ на яго кожны павінен знайсці сам.

На жаль, і па сённяшні дзень ў "афіцыйнай або ідэалагічна вытрыманай" беларускай літаратуры на постаць Ларысы Геніюш накладзена забарона, таму, адпаведна, і творы гэтай таленавітай паэткі ЗАБАРОНЕНЫ для вывучэння ў школе. На дзяржаўным узроўні паэтку вінавацілі і вінавацяць дагэтуль у калабарацыянізме і г.д., на неафіцыйным – тэматыка творчасці Ларысы Геніюш, быццам перпендыкуляр, разыходзіцца з савецкімі панегірыкамі Куляшова, Броўкі, Крапівы. Сярод паэтаў да- і пасляваеннага дзесяцігоддзя Геніюш вызначаецца індывідуальнасцю стыля і, што самае галоўнае, індывідуальнасцю тэматыкі: Геніюш ўваходзіць у лік Літаратараў, якія свой творчы патэнцыял не гублялі на ўслаўленне Леніна-Сталіна і апяванне "перавагаў" камуністычна-таталітарнага рэжыму над "загнивающим капитализмом", а пісалі пра Радзіму, пра людскія пакуты ад канфлікту двух таталітарных рэжымаў.

Найбольш яскрава і поўна талент пісьменніцы выявіўся ў патрыятычнай тэматыцы, асабліва ў вершах лагернага перыяду. Творчасць Ларысы Геніюш прасякнута пачуццём Любові да Бацькаўшчыны, Любові да Беларусі. Літаратурная спадчына паэткі, скіраваная на абуджэнне нацыянальнай годнасці і самасвядомасці беларусаў, была не запатрабаваная таталітарным молахам, нажаль, яна не запатрабаваная і сёння (для тых, хто здатны рабіць самастойныя высновы – ёсць прапанова правесці паралелі). А паколькі ніжэй прыведзены твор Ларысы Геніюш ВЫКРЭСЛЕНЫ з літаратуры для "душеспасительного чтения" і ў перыёдыцы нашага часу быў надрукаваны толькі аднойчы ў 1991г. у адной з газет беларускага замежжа, звяртаючыся да будучых і дзеючых настаўнікаў усіх прафесій – ад фізіка да настаўніка фізічнага выхавання, – настойліва рэкамендуем азнаёміць з ім сваіх вучняў.

**Андрэй ЛЯЎЧУК**

### АФІЦЫЙНАЯ ВЕРСІЯ

"Неўзабаве пасля варожага ўварвання асноўная маса працоўных Беларусі стала на шлях барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, за свабоду і незалежнасць Беларусі. Жорсткасць акупацыйнага рэжыму толькі ўзмацніла нянавісць да акупантаў, рабіла супраціўленне асабліва ўпартым і непрымірымым. На захопленых ворагам тэрыторыях стваралася сетка падпольных цэнтраў, арганізацый і груп. Яркая старонка гэтай барацьбы – Менскае падполле... З першых дзён акупацыі горада падпольшчыкі ўчынялі дыверсіі... У 1943г. менскія падпольшчыкі разам з партызанамі ажыццявілі аперацыю па забойстве гаўляйтэра Беларусі Кубэ, падлажыўшы яму ў ложак міну. Удзельнікі гэтай аперацыі А.Мазанік, М.Осіпава, Н.Траян сталі Героямі Савецкага Саюза". **(Паводле Гісторыя Беларусі. 9 клас. Мн. 1993, Матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн. 2001г)**

**Гістарычны сектар**

## *Ларыса Геніюш*

# ПАРТЫЗАНЫ

Як запомню войны і пажары –
Ўсё пабоішчам мая зямля,
Колькі раз па ёй, бы лівень з хмараў,
Кроў чужая і свая плыла.
Продак мой, спыняючы нашэсце,
Кідаўся на ворага з мячом,
Толькі б не цярпелі сем'і, дзеці,
За плячыма захаваўся дом!
І стаялі насмерць, усенародна,
Супраць недругаў суровых і ліхіх.
І не пакідалі безбаронных,
Ворагаў наклікаўшы на іх.
..........................................................
Партызаны ж, тыя партызаны,
Што ім сёлы, боль і енк людскі,
Толькі б мосцік недзе быў узарваны,
Ды зляцелі з рэйкаў цягнікі.
Што для іх адкрытыя магілы,
Дзе за рэйкі кідалі дзяцей,
Не, дзяцей яны не баранілі,
Солтыса забіць куды прасцей.
Солтыса, які акручваў Немца,
Каб ад згубы ратаваць сяло.
Бо куды ж было народу дзецца,
Помачы адкуль чакаць было?
Нашы пушчы, роднае багацце,
Непралазнасць зарасляў, балот:
Партызанам ёсць куды схавацца,
А куды ж схаваецца народ?
А куды ж схаваюцца мільёны
Ў кінутай нашэсцю старане,
Дзеці ў гэтых сёлах безбаронных,
Калі ўсе мужчыны на вайне?
..........................................................
Пішуць вершы, повесці, раманы,
Усё ж няма там ні слаўца нідзе,
Каб грудзьмі стаялі партызаны
За расстрэляных, за спаленых людзей!
То не подзьвіг баявы і смелы,
Толькі брэх сабачы і пусты.
Наклікаць на сёлы смерць умелі,
А самыя шпарылі ў кусты!
Выстаўлялі немаўлят пад стрэлы
І слабых жанчын пад кулямёт,
Ім за рэйкі дык душа балела,
Не балела толькі за народ!
Жаль народны, што не знае меры,
Дым з абпаленых, загубленых касцей,
Партызаны, горшыя як зверы,
Звер той ворагу не кідае дзяцей,
А пакуль ёсць кіпцюры і зубы,
Засланяе ён малых сабой,
Не бяжыць у сасоннік ад загубы,
А ў няроўны кідаецца бой.
Нават тая птушачка малая,
Люта скача злыднем да вачэй,
У горы птушанят не пакідае,
Лепей згіне за сваіх дзяцей!
..........................................................
Хваляцца, каго яны забілі,
Ці праз іх загінула дарма.
А каго яны абаранілі?
Гэткіх на ўліку ў іх няма.
..........................................................
Йшлі інструкцыі ў адным напрамку,
Палымнела Беларусь адна,
А чаму ж не падымалі партызанкі
На Каўказе ці каля Арла?
..........................................................
Аднаго забілі часам гада,
І, забіўшы, зайцамі ўцяклі,
А за гада сотні леглі градам
Безбаронных жыхароў зямлі.
І няўцям да сёння той Мазанік,
Як лілася ў Менску наша кроў, –
Не не партызан, не партызанак,
А ў мучэннях выжыўшых сыноў.
Калі судзіш ворагаў за згубу,
Першым чынам засланяй сваіх,
Эх, Мазанік, за аднога Кубэ
Колькі нашых брацтў нежывых...
Ці яны ў начы табе не сняцца,
Тысячаў замучаных не жаль?
Што ж табе, Мазанік, нашы брацця,
Для цябе галоўнае – медаль...
..........................................................
Край мой любы, жытні і курганы,
На няласцы нелюдзяў чужых,
І калі мне кажуць: партызаны,
Жудасна мне робіцца ад іх.

# РАДЫЯЦЫЯ І ЧАЛАВЕК

РАДИАЦИЯ ПО САМОЙ СВОЕЙ ПРИРОДЕ ВРЕДНА ДЛЯ ЖИЗНИ. МАЛЫЕ ДОЗЫ ОБЛУЧЕНИЯ МОГУТ "ЗАПУСТИТЬ" НЕ ДО КОНЦА ЕЩЕ УСТАНОВЛЕННУЮ ЦЕПЬ СОБЫТИЙ, ПРИВОДЯЩУЮ К РАКУ ИЛИ К ГЕНЕТИЧЕСКИМ ПОВРЕЖДЕНИЯМ. ПРИ БОЛЬШИХ ДОЗАХ РАДИАЦИЯ МОЖЕТ РАЗРУШАТЬ КЛЕТКИ, ПОВРЕЖДАТЬ ТКАНИ ОРГАНОВ И ЯВИТЬСЯ ПРИЧИНОЙ СКОРОЙ ГИБЕЛИ ОРГАНИЗМА.

После аварии на Чернобыльской АЭС радиация прочно вошла в нашу жизнь. Для жизни и здоровья жителей нашей республики появилась новая угроза. Но у людей всегда хватало забот – к радиации, в итоге, привыкли и почти не обращают внимания, тем более, что её не видно и не слышно. Значит, и проблему решим, когда она проявится зримо…

Повреждения, вызываемые большими дозами облучения, обыкновенно проявляются в течение нескольких часов или дней. Поэтому такие опасные проявления радиации всегда замечаются, и применяются соответствующие меры. Раковые заболевания, однако, проявляются спустя много лет после облучения – как правило, не ранее чем через одно-два десятилетия. А врождённые пороки развития и другие наследственные болезни, вызываемые повреждением генетического аппарата, по определению проявляются лишь в следующем или последующих поколениях: это дети, внуки и более отдаленные потомки индивидуума, подвергшегося облучению. Именно из-за большого промежутка времени, прошедшего после облучения, своевременные меры не предпринимаются.

Малые дозы радиации не могут сразу же погубить человеческий организм, но и здоровья они тоже не прибавляют. Мало того, малые дозы радиации приводят к раковым заболеваниям, а также к различным нежелательным изменениям в организме и потомстве. Сам процесс мало изучен, опять же из-за ограниченности времени.

Красный костный мозг и другие элементы кроветворной системы наиболее уязвимы при облучении и теряют способность нормально функционировать: уже при дозах облучения 0,5-1 Гр. К счастью, они обладают также замечательной способностью к регенерации, и если доза облучения не настолько велика, чтобы вызвать повреждения всех клеток, кроветворная система может полностью восстановить свои функции. Если же облучению подверглось не всё тело, а какая-то его часть, то уцелевших клеток мозга бывает достаточно для полного возмещения поврежденных клеток.

Репродуктивные органы и глаза также отличаются повышенной чувствительностью к облучению. Однократное облучение семенников при дозе всего лишь в 0,1 Гр приводит к временной стерильности мужчин, а дозы свыше двух грэев могут привести к постоянной стерильности: лишь через много лет семенники смогут вновь продуцировать полноценную сперму.

Наиболее уязвимой для радиации частью глаза является хрусталик. Погибшие клетки становятся непрозрачными, а разрастание помутневших участков приводит сначала к катаракте, а затем и к полной слепоте. Чем больше доза, тем больше потеря зрения. Помутневшие участки могут образоваться при дозах облучения 2 Гр и менее. Более тяжелая форма поражения глаза – прогрессирующая катаракта – наблюдается при дозах около 5 Гр. Показано, что даже связанное с рядом работ профессиональное облучение вредно для глаз; дозы от 0,5 до 2 Гр, полученные в течение 10-20 лет, приводят к увеличению плотности и помутнению хрусталика.

Рак – наиболее серьезное из всех последствий облучения человека при малых дозах, по крайней мере, непосредственно для тех людей, которые подверглись облучению. В самом деле, обширные обследования, охватившие около 100 000 человек, переживших атомные бомбардировки Хиросимы и Нагасаки в 1945 году, показали, что пока рак является единственной причиной повышенной смертности в этой группе населения.

Самое страшное, что дети крайне чувствительны к действию радиации. Относительно небольшие дозы при облучении хрящевой ткани могут замедлить или вовсе остановить у них рост костей, что приводит к аномалиям развития скелета. Чем меньше возраст ребенка, тем сильнее подавляется рост костей. Суммарной дозы порядка 10 Гр, полученной в течение нескольких недель при ежедневном облучении, бывает достаточно, чтобы вызвать некоторые аномалии развития скелета. Крайне чувствителен к действию радиации и мозг плода, особенно если мать подвергается облучению между восьмой и пятнадцатой неделями беременности. В этот период у плода формируется кора головного мозга, и существует большой риск того, что в результате облучения матери (например, рентгеновскими лучами) родится умственно отсталый ребенок. Облучение в терапевтических дозах, однако, применяют обыкновенно для лечения рака, когда человек смертельно болен.

## ГЕНЕТИЧЕСКИЕ ПОСЛЕДСТВИЯ ОБЛУЧЕНИЯ.

Изучение генетических последствий облучения связано с еще большими трудностями, чем в случае рака. Во-первых, очень мало известно о том, какие повреждения возникают в генетическом аппарате человека при облучении; во-вторых, полное выявление всех наследственных дефектов происходит лишь на протяжении многих поколений; и, в-третьих, как и в случае рака, эти дефекты невозможно отличить от тех, которые возникли совсем по другим причинам.

Хотя наследственные дефекты и так встречаются достаточно часто, всякое дополнительное облучение может еще более увеличить частоту их появления. Около 10% всех живых новорожденных имеют те или иные генетические дефекты.

**Подготовил Дмитрий ШЕСТАК**
**(по материалам зарубежной прессы)**

**P.S. За более подробной информацией о влиянии на человека малых доз радиации обращайтесь в редакцию «Дзедзіча».**

## УВАГА!!!

**БАМГА "Сузор'е" абвяшчае дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі ІАБ "Дзедзіч"**

**Студэнтаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:**

**– Выказаць свае думкі,**
**– Навучыцца пісаць артыкулы,**
**– Зірнуць на акаляючы свет вокам журналіста,**
**– Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,**

**просім звязацца з намі па тэл.: 20-57-41 з $18^{00}$ да $21^{00}$.**
**Маб.: (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**
**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

## ПАРТЫЯ БНФ

**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**

- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**

- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
**Тэлефануй: 25-70-55; (029) 641-20-98.**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці.**
**Тэл. (0162) 20-57-41.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці.**
**Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 20-57-41.**

АБ'ЯВЫ

# БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ МОЛАДЗЕВЫХ НДА

У памяшканні БАМГА "Сузор'е" адкрылася бібліятэка НДА для прадстаўнікоў моладзевых арганізацый Берасцейшчыны і проста ініцыятыўных людзей. Яна змяшчае кнігі і дапаможнікі па арганізацыі дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Карысную літаратуру па рэгістрацыі НДА, арганізацыі справаводства, пошуку фінансавання, працы з валанцёрамі, Public Relations у НДА і шмат-шмат іншай цікавай інфармацыі можна знайсці, звярнуўшыся ў БАМГА "Сузор'е".

Бібліятэка ўтрымлівае таксама літаратуру па наступных раздзелах:

– Выбары (арганізацыя выбарчых кампаніяў, агітацыя, назіранне);

– СМІ (рэгістрацыя і дзейнасць газет, рэкламная дзейнасць, нарматыўна-прававыя акты);

– Правы чалавека (метадычныя дапаможнікі, маніторынг парушэнняў правоў чалавека на Беларусі, міжнародныя акты і інш.);

– Гісторыя Беларусі (навуковыя матэрыялы, падручнікі, папулярная літаратура);

– Моваздаўства (слоўнікі, дапаможнікі для тых, хто вывучае беларускую мову);

– Бюлетэні, брашуры і часопісы НДА Берасцейшчыны і краіны;

– Замежная літаратура (слоўнікі, кнігі, часопісы, газеты на ангельскай, польскай, украінскай, літоўскай і латвійскай мовах; матэрыялы па краязнаўству суседніх (і не вельмі) краін на беларускай мове);

– Мастацкая літаратура (на беларускай і расейскай мовах).

Бібліятэка чакае наведвальнікаў штодня з $12^{00}$ да $16^{00}$ (акрамя суботы і нядзелі). Заходзьце, не пашкадуеце. Калі патрэбнай вам літаратуры няма (і такое можа здарыцца), супрацоўнікі бібліятэкі дапамогуць у яе пошуку.

**Dzedzich week-news**

# МІЖНАРОДНАЯ ЗІМОВАЯ ШКОЛА ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Хельсінская Фундацыя (Варшава, Польшча) праводзіць 28 лютага - 7 сакавіка 2004 года ў Варшаве чарговую Міжнародную зімовую школу па правах чалавека.

Да ўдзелу ў мерапрыемстве запрашаюцца сябры прававых клінік, актывісты праваабарончага руху з краінаў СНД, што яшчэ не прымалі ўдзелу ў школах, арганізаваных Хельсінскай Фундацыяй.

Працоўная мова школы – расейская.

Асобы, што жадаюць узяць удзел у Міжнароднай зімовай школе, мусяць даслаць факсам альбо электроннай поштай наступныя дакументы:

– запоўненую заяўку на ўдзел;

– кароткую аўтабіяграфію;

– рэкамендацыю ад арганізацыі.

Апошні тэрмін – 30 снежня 2003.

Падрабязнасці, праграму і аплікацыйную форму глядзіце на сайце Фундацыі http://www.hfhrpol.waw.pl/ru/index.htm.

**Кантакты:** Адам Пырэк, Хельсінская Фундацыя па правах чалавека.

Zgoda 11, 00-026 Warszawa

Tel./fax: (+48 22) 556 44 40, 828 10 08, 828 69 96

**Электронная пошта:** A.Pyrek@hfhrpol.waw.pl

**Dzedzich week-news**

# ПАДТРЫМКА З БОКУ ОФІСА ВЯРХОЎНАГА КАМІСАРА ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Праект ACT (Assisting Communities Together) Офіса Вярхоўнага Камісара па правах чалавека ААН і Праграмы Развіцця ААН накіраваны на падтрымку невялікіх арганізацый, што займаюцца дзейнасцю ў галіне адукацыі па правах чалавека. Ажыццяўляецца фінансавая падтрымка ў памеры не болей за 15000$, але звычайна даюцца гранты ў памеры 500-3000$. Дзеянне праграмы распаўсюджваецца на Беларусь. Працэс атрымання падтрымкі звязаны з мясцовым прадстаўніцтвам Праграмы Развіцця ААН.

Падрабязнасці - на сайце http://www.unhchr.ch/html/menu2/9/civilsup/actproj.htm.

**Кантакты:** ACT Project, OHCHR, Palais des Nations

CH - 1211 Geneva 10, Switzerland

Fax: +41 22 917 90 61.

**Электронная пошта:** agirard@ohchr.org.

**Dzedzich week-news**

# КАНТАКТУЙ З БМА!

Беларуская музыка на касетах і CD.

Толькі ў нас пастаянныя святочныя зніжкі!

Набудзь пяць дыскаў – шосты атрымаеш задарма!!! Магчыма дастаўка на дом.

Прапануем заробак распаўсюднікам у Менску і рэгіёнах.

Кантактуй з намі: 8 (0296) 49 08 88, pager: 211 85 85 аб. БМА.

220085, г. Менск, а/с 5, wital@tut.by, www.BMA.home.by.

# ПАВІНШУЙ СЯБРОЎ

Павіншуй сваіх знаёмых, сяброў, каханых пабеларуску і канешне ж беларускай песняй!

**Радыё РОКС.** Штодня з 13.00 да 14.00, з 21.00 да 22.00. Факс: 288-20-13, 269-09-27. Пошта: 220002, г. Менск, вул. Старажоўская, 8А. E-mail: musicbox@roks.com, radio@roks.com, www.roks.com.

**Радыё 1.** Штодня з 20.10 да 21.30. Паштоўка за месяц на адрас: г. Менск, вул. Чырвоная, 4 (праграма "Вітаем! Віншуем! Жадаем!").

**Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-ДЫЗАЙНЕРА

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**

**Тэл.: (029 )660-57-41.**

## БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас “беларускай палічкі”: www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

## ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв.4.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках “Дзедзіча”, якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

## УВАГА!

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь “Дзедзіч” для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв. 4.**

Чаму ты вырашыў падпісацца:

Прозвішча:

Імя:

Імя па бацьку:

Паштовы адрас:

Тэлефон:

## ДАРЭЧЫ

Запрашаюцца бойкія, разумныя дзяўчыны для працы ў кааператыве «Трах-тарарах». Не бойцеся – не «Гербалайф»!

***

Піша Сярожа ліст бацькам з інстытута. "Жыву добра, усё цудоўна, але ёсць адна праблема: усе студэнты ездзяць на тралейбусах, а я на машыне!"

Праз некаторы час прыходзіць адказ ад бацькоў: "Сынок, атрымалі твой ліст. За машыну не хвалюйся. Высылаем табе крыху грошаў – купі тралейбус і ездзі, як усе людзі!"

***

Падзывае Ліцвін, спікер украінскай Рады, да сябе галаву УНА-УНСО Андрэя Шкіля і кажа:

– Андрию, е дви новыны, одна хороша, друга погана...

– Ну, давайтэ хорошу.

– Кляти москали сказалы, шо острив Тузла – украинська земля.

– Та-а-к, а погана?

– Вийны нэ будэ!!!!!!

***

Ізраіль.

Прэм'ер-міністр гэтай краіны выступіў з чарговай мірнай ініцыятывай. "Пазабіваць усіх арабаў, – заявіў ён, – і на шматпакутнай габрэйскай зямлі нарэшце запануе мір".

***

Усама бэн Ладэн на экскурсіі ў Італіі, аглядае славутыя мясціны. Падыходзіць да Пізанскай вежы і, пасміхаючыся, кажа:

– Дылетанты...

***

– Дзяўчынка, як цябе клічуць?

– Жучка.

– А чаму такое імя дзіўнае?!

– Ды проста бацькі сабачку заўжды жадалі...

***

Тэлефон. Слухаўку бярэ маленькі хлопчык.

– Вам каго? – пытае.

– Тата дома?

– Не, кудысьці паехаў...

– На адпачынак?

– Ды не, ён паехаў з мамай...

***

Сабакі і каты – сябры чалавека! Яны упрыгожваюць жыццё, а ў цяжкія часы і стол!

***

У сямейнай пары маленькі хлопчык не размаўляў 6 гадоў, што толькі бацькі не рабілі. Аднойчы за сняданкам сын абвясціў:

– Ізноў гэтая манка – цярпець яе не магу!

Шчасцю бацькоў не было межаў.

– Чаму ты ўвесь гэты час нічога не гаварыў?

– Таму што пакуль усё нармальна было.

***

Калі святло ў прыбіральні выключаецца з гукам "Э-эй", значыць, там хтосьці ёсць.

***

Жанчыны-медыкі п'юць да страты пульсу, жанчыны-хімікі – да страты рэакцыі, дык падымем жа нашы бакалы за жанчын-фізікаў, якія п'юць да страты супраціўлення!

Шмульберг, уладальнік фірмы па вытворчасці цвікоў, кліча свайго сына і кажа:

– Ізя, я хачу на пэўны час даручыць табе кіраванне фірмай: я столькі гадоў працаваў без адпачынку і хачу нарэшце адпачыць. Я з'язджаю на 3 месяцы на Багамы і хачу, каб ты сам вырашаў усе праблемы і не турбаваў мяне.

З'ехаў ён на Багамы, адпачывае па поўнай праграме, але праз месяц яму тэлефануе сын:

– Тата, я даў рэкламу – і цяпер цвікі разыходзяцца так, што мы не паспяваем іх вырабляць. Я не ведаю, што рабіць. Прыязджай, дапамажы!

На наступны дзень Шмульберг прыбывае дамой і пытае сына:

– Ізя, як ты здолеў так наладзіць збыт?!!

– Усё вельмі проста: я даў рэкламу... Вунь, бачыш – рэкламны плакат на сцяне вісіць?

Шмульберг глядзіць на плакат і бачыць на ім Хрыста, распятага на крыжы, а унізе надпіс: «Цвікі Шмульберга – дзякуючы ім ён трымаецца ўжо 2000 гадоў!».

Шмульберг:

– Ізя, што ты нарабіў?!! Здымі зараз жа ўсе гэтыя плакаты і запомні: ніколі не выкарыстоўвай імя і вобраз Ісуса Хрыста ў рэкламных мэтах! Ты што – хочаш, каб ізноў пачаліся пагромы?!

Пасля гэтага Шмульберг зноў з'ехаў на Багамы. Яшчэ праз месяц сын зноў тэлефануе:

– Тата, я змяніў рэкламу, цвікі па-ранейшаму разыходзяцца, вытворчасць працуе на ўсю, і ў мяне цяпер праблемы з дастаўкай. Прыязджай!

Шмульберг вяртаецца ў горад, і сын паказвае яму новую рэкламу – плакат, на якім намаляваны пусты крыж, а ўнізе надпіс: «Трэба было выкарыстоўваць цвікі Шмульберга!».

***

Сядзіць рыбак на беразе Ніла і вудзіць рыбу. Спёка жудасная, духата, пекла, ды яшчэ і рыба не ловіцца. Раптам падплывае кракадзіл і так спачувальна ў рыбака пытаецца:

– Што, спякотна?

– Угу...

Кракадзіл, з надзеяй:

– Можа, тады паплаваеш?

***

У самалёце Ту-154 капітан дакладае на зямлю:

– У нас сапсавалася ўся сістэма кіравання самалётам!

Дыспетчар:

– Зразумеў, выкрэсліваю.

***

– Божа мой, як мне ўсё надакучыла, каб ты ведала! – гаворыць ён ёй, нервова запальваючы цыгарэту. – Жывеш ты ў чорта на рагах: гэтыя прававанні ў мяне ўжо ў пячонках сядзяць! Кватэра ў цябе дурацкая, паліць шкодна, цалавацца нельга, музыка каб не крычала... Як мне абрыдла чакаць цябе на гэтых дурацкіх спатканнях, сустракаць пасля заняткаў, давіцца з табой гамбургерамі замест нармальнай вячэры, тырчаць на марозе на брудных лаўках... А грошаў колькі на кветкі змарнаваў!

Яна з жахам глядзела на яго, і ў вачах яе ўжо збіраліся буйныя кроплі слёз.

– Карацей, – жорстка працягваў ён, – замахала ты мяне канчаткова. Усё, канец... Давай ажэнімся!

## ДЗЯЎЧЫНАМ ПРА ВАМПІРАЎ

*Артыкул у жаночы часопіс*

Свет каціцца ў прорву. У гэтым нас асабліва пераконвае галівудскі экран, на які маса выплеснуліся фільмы пра вампіраў.

Такім чынам, беражыцеся вампіраў. Вось вы позна ўвечары сабраліся на спатканне. Поўня, дзесьці страшэнна плача немаўля...

Як жа іх пазнаць? Прааналізаваўшы мноства фільмаў, прапануем такія варыянты:

– Як вядома, усе вампіры ненавідзяць часнок. Прапануем прапаласкаць рот свежым настоем часнаку перад першым пацалункам.

Калі хлопец адмовіцца цалавацца - гэта будзе трывожнай прыкметай.

– Срэбра. Смяротны метал для вампіраў. Абдыміце пяшчотна свайго выбранніка і нанясіце яму моцны ўдар куды-небудзь у мяккае месца вострым срэбраным прадметам. Сачыце за рэакцыяй партнёра. Калі яна будзе неадэкватная - беражыцеся.

– Найлепшай зброяй супраць вампіраў з'яўляецца, канешне, асінавы кол. У старых выданнях прапануецца забіць кол прама ў сэрца ахвяры. Пагаджаючыся з эфектыўнасцю гэтага метада, усё ж заўважым, што метад занадта радыкальны: нармальны быў чалавек, вампір - усё роўна ў выніку будзе мерцвяк. Таму прапануем ашчадную методыку. Як вядома, айчынныя запалкі вырабляюць з асіны. Для маскіроўкі запаліце і, патушыўшы запалку, з сілай уваткніце яе партнёру ў шыю.

Сачыце за рэакцыяй! Калі твар перакосіцца ад болю і непаразумення – беражыцеся. Вампіры страшэнныя ў гневе!

– Святое пісанне. Лічым нязручным для выкарыстання. Наўрад ці ў вас атрымаецца хутка выхапіць з-пад вопраткі кнігу, што памерамі і вагою нагадвае цагліну. Таму прапануем падчас абдымкаў ласкава нашаптаць любаму некалькі радкоў малітвы.

Заўважана, што ў вампіраў падчас гэтай працэдуры акругляюцца вочы, знікае страсць і пачынае часацца галава.

– Крыж. Усе крыніцы пагаджаюцца з тым, што тут галоўнае - памер. Замяніце свой нацельны крыжык на што-небудзь больш грунтоўнае, кшталту таго крыжа, які носяць праваслаўныя святары. Дзейсным сродкам будзе пацалаваць крыж і разоў 5-6 перахрысціць выбранніка. Добра было б, каб у другой руцэ ў вас было кадзіла памерам з турыстычны кацялок.

Заўважана, што 99% вампіраў збягаюць адразу пасля такой працэдуры.

– У вампіраў, як вядома, вельмі развітыя клыкі. Але тады, калі яны вырастаюць, звычайна бывае ўжо позна. Таму нялішнім будзе ўзяць на спатканне стаматалагічнае люстэрка. Самы зручны момант для праверкі - калі ваш партнёр прыадчыніў вусны для пацалунка.

Смела суйце яму ў рот люстэрка і даследуйце. Зноў жа, яго неадэкватная рэкцыя павінна вас насцярожыць.

Думаем, што, комплексна авалодаўшы гэтымі метадамі, вы забяспечаныя ад розных непрыемнасцяў. Усе вампіры будуць абыходзіць вас здалёк. І вы пераканаецеся, што 100% вашых выбраннікаў, як мінімум, [redacted]

№6 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
снежань 2003

**ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ**

**Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі**

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі [redacted]
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах ун[redacted]
**Падпісана ў друк:** 15.12.2003 у 18[00]
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксера[redacted]

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, М. Сіман[redacted]
С. Прылуцкі, С. Камінскі.
**Адказны сакратар:** А. Ляўчук. **Вёрстка:** Б[redacted]

**Кантактны тэлефон:** (0162) 20-57-41, (029) 6[redacted]
**E-mail:** dzedzich@mail.ru